*Н.У.САМЕРСАВА*

# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЕ ПРАЕКТАВАННЕ І ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ АСОБЫ

Праектыўная (праектная) дзейнасць адносіцца да інавацыйнай, творчай дзейнасці, таму што прадугледжвае пераўтварэнне рэчаіснасці, будуецца на базе адпаведнай тэхналогіі, якую можна уніфікаваць, асвоіць і ўдасканаліць. Зразумела, што паспяховасць дзейнасці спецыяліста сацыякультурнай сферы ў значнай ступені залежыць ад таго, наколькі ён валодае тэхналогіяй сацыякультурнага праектавання, змест якой складаюць кампетэнтны аналіз канкрэтнай сітуацыі, распрацоўка і рэалізацыя праграм, што паляпшаюць асноўныя складаючыя чалавечай жыццядзейнасці.

Па гэтай прычыне актуальным, на наш погляд, з'яўляецца ўключэнне ў вучэбны план падрыхтоўкі студэнтаў курса "Асновы сацыякультурнага праектавання". Такі курс распрацаваны на кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці БДУ культуры. Мэта курса заключаецца ў тым, каб забяспечыць будучых спецыялістаў (у нашым выпадку гэта будучыя сацыяльныя педагогі і сацыяльныя работнікі) тэхналогіяй інавацыйнай дзейнасці, метадамі канструявання і праграміравання аб'ектаў, якія адносяцца да сацыяльна-псіхалагічнага і сацыяльна-культурнага асяроддзя. Падаецца важным і значным сфарміраваць праектныя якасці і здольнасці асобы студэнта, яго ўменне канструяваць асабістыя тэхналагічныя падыходы да вырашэння задач у нестандартных сітуацыях, якія мяняюцца па прычыне дынамічнасці жыцця.

Актуальнасць авалодання асновамі сацыякультурнага праектавання абумоўлена і тым, што дадзеная тэхналогія мае шырокую сферу выкарыстання спецыялістамі ўсіх прафесій сацыякультурнага напрамку. Авалоданне логікай і тэхналогіяй гэтай дзейнасці дасць магчымасць будучым спецыялістам найбольш эфектыўна здзяйсняць аналітычныя, арганізацыйна-кіруючыя і кансультацыйна-метадычныя функцыі ў сацыяльна-культурнай сферы. Немалаважным з'яўляецца і той факт, што праектныя тэхналогіі забяспечваюць канкурэнтаздольнасць нашага спецыяліста на рынку працы. Уменне распрацаваць сацыяльна значны праект і афарміць заяўку на яго фінансаванне – гэта рэальная магчымасць стварыць рабочае месца як у рамках існуючых устаноў і арганізацый, так і па-за імі.

Агульную логіку фарміравання праекта можна ўявіць наступным чынам:

– праблематызацыя (вызначэнне актуальнасці і значнасці праблемы, якая мае патрэбу ў хуткім вырашэнні);

– мэтамеркаванне (пастаноўка канкрэтнай мэты для вырашэння праблемы, а таксама задач, рашэнне якіх вядзе да здзяйснення мэты);

– інструменталізацыя (метады, якія будуць выкарыстаны ў час работы над праектам, мерапрыемствы і змест самой дзейнасці);

– рэсурсы (сродкі, без якіх немагчыма праектнае рашэнне).

Усё гэта ў сукупнасці стварае агульную структуру і алгарытм праектнай дзейнасці. Аснову таго ці іншага віду і тыпу праектавання складаюць праблемы сацыяльнай, культурнай і духоўнай сфер жыццядзейнасці чалавека. Аднак праблемы павінны разглядацца з двух пунктаў гледжання: з аднаго – гэта аб'ектыўныя цяжкасці, перашкоды, а з другога – гэта вынік усведамлення, разумення сітуацыі, бачання ў ёй вызначанай супрацьлегласці (неадпаведнасць рэальнага і жадаемага, мэты і выніку, існуючага і будучага).

Праблемы фармулююцца на аснове аналізу сацыякультурнай сітуацыі, якая ўяўляе сабой сукупнасць умоў і фактараў, дзе існуе асоба ці сацыяльная група. Асаблівую актуальнасць у кантэксце сацыякультурнага праектавання набываюць сёння сацыяльна-псіхалагічныя праблемы. У праектаванні дзейнасці ў гэтым напрамку асобую значнасць набывае так званы рэабілітацыйны аспект (фактар). Менавіта характар сацыяльна-псіхалагічнай (псіхолага-педагагічнай) рэабілітацыі вызначае сэнсавую і зместавую аснову большасці нашых праектаў.

Асабістыя (сацыяльна-псіхалагічныя, жыццёвыя) праблемы – гэта перш за ўсё суб'ектыўная ацэнка чалавекам сваіх жыццёвых умоў і абставін. Яны перажываюцца як унутраны дыскамфорт, дэфіцыт чагосьці суб'ектыўна значнага (напрыклад, адзінота, міжасобасныя канфлікты, неразуменне з боку блізкіх, занепакоенасць, незадаволенасць сабой ці сваім сацыяльным статусам і інш.). Асабістыя праблемы – гэта ступень разумення суб'ектам праектавання рэальных жыццёвых цяжкасцей, носьбітам якіх з'яўляецца чалавек ці сацыяльная група.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, сацыякультурныя і асабістыя праблемы – гэта характарыстыка сацыякультурнай сітуацыі з боку праекціроўшчыка і з боку той сацыяльнай групы, якой будзе адрасаваны праект. Суб’екту праектавання неабходна ўлічваць, што паміж дзвюма гэтымі групамі праблем існуе цесная сувязь: нявырашанасць сацыякультурных праблем павялічвае асабістую праблематыку.

Распрацоўка праектаў па чарнобыльскай тэматыцы паказала, што значная частка насельніцтва (так званыя “чарнобыльцы”) не ўяўляе, якую канкрэтную дапамогу можна атрымаць ад сацыяльных работнікаў, псіхолагаў, работнікаў сферы культуры. Між тым “ахвяра Чарнобыля” як з’ява характарызуецца зніжэннем патрабавальнасці да сябе, звужэннем кола матываў жыцця-дзейнасці, незадаволенасцю сваім становішчам, стратай сэнсу існавання. Людзі адчуваюць сябе ізгоямі, маюць парушаныя сувязі з іншымі групамі насельніцтва. У іх ёсць цяжкасці ў зносінах, для іх характэрны агрэсіўны тып паводзін. Вельмі моцныя парушэнні назіраюцца ў эмацыянальнай сферы: дэзадаптацыя, трывожнасць, эмацыянальная няўстойлівасць, высокая ўзбуджальнасць і інш. Але, як паказала даследаванне, у большасці забруджаных раёнаў адсутнічаюць умовы для сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі насельніцтва [2].

З улікам сказанага на кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці быў распрацаваны праект дзейнасці цэнтра сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай рэабілітацыі дзяцей, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы. Змест рэабілітацыйнай работы быў часткова апрабаваны і меў добры вынік ва ўмовах дзейнасці рэабілітацыйнага цэнтра “Надзея”, у якім праходзілі практыку будучыя сацыяльныя педагогі. Аснову рэабілітацыйнай дзейнасці склала так званая тэрапія сродкамі мастацтва, якая з’яўляецца, на наш погляд, найбольш эфектыўным спосабам ўздзеяння на асобу любога ўзросту (на дзяцей асабліва) па ліквідацыі псіхалагічных вынікаў ад перанесенага стрэсу. Намі быў распрацаваны шэраг заняткаў па гульнёвай тэрапіі, тэатра- і музыкатэрапіі, тэрапіі сродкамі выяўленчага мастацтва і інш. Акрамя зместу самой рэабілітацыйнай работы, праект прадугледжваў метадычныя рэкамендацыі як для суб’ектаў дзейнасці, так і для арганізатараў рэабілітацыйнага працэсу. Была распрацавана і лагічна абгрунтавана структура дзейнасці розных падсістэм, якія павінны працаваць комплексна.

Спектр праблем вельмі разнастайны і часта залежыць ад “сацыяльнага заказу” таго соцыуму, у якім праходзяць практыку студэнты. Паспяхова распрацоўваюцца такія праблемы, як цяжкасці падлеткавай сацыялізацыі ў сферы нефармальных зносін; інтарэсы людзей сталага ўзросту; дзеці-сіроты як сацыяльная з’ява; крызісная дапамога жанчынам, якія пакутуюць ад насілля, і інш.

Спецыфіка сацыяльна-культурнага праектавання па аказанні адраснай сацыяльна-псіхалагічнай, сацыяльна-педагагічнай дапамогі заключаецца ў тым, што ў аснову распрацоўкі такога праекта пакладзена ідэя духоўна-маральнай культуры, якая пранізвае ўсе формы чалавечага жыцця. Мараль, духоўнасць, гібка рэагуючы на змены сацыяльнай практыкі, выступаюць самымі моцнымі рэгулятарамі жыцця чалавека і грамадства, уздзейнічаючы непасрэдна на паводзіны людзей ва ўсіх сферах іх жыццядзейнасці.

Праблемнае поле праектавання пры гэтым абумоўлена шэрагам негатыўных тэндэнцый, якія звязаны са стратай значнай часткай насельніцтва маральна-духоўных ідэалаў, дэвальвацыяй фундаментальных каштоўнасцей: дабрыні, спачування, сумлення, сацыяльнай справядлівасці. У грамадскім усведамленні маюць месца і нават набіраюць моц арыентацыі, заснаваныя на прынцыпах насілля, барацьбы, нянавісці, нецярпімасці.

Мараль як базавая аснова культуры парушана празмернай палітызацыяй грамадскага жыцця і індывідуальнага ўсведамлення, прычым тэндэнцыя падначаленасці маралі задачам палітыкі набірае моц. І таму найбольш актуальнымі праблемамі, характэрнымі для дадзенай праектнай дзейнасці, з’яўляюцца крызіс духоўна-маральных каштоўнасцей, які выкліканы неразуменнем спецыфікі роднай, айчыннай культуры (на жаль, вялікая колькасць маладых і не толькі маладых людзей запазычваюць каштоўнасці і стэрэатыпы, характэрныя для заходняга тыпу культуры, – культ геданізму, індывідуалізму, рацыяналізму і інш.). Праблематыку праектнай дзейнасці ў апошні час складае дыфіцыт міласэрнасці ў грамадстве, рост агрэсіўнасці, жорсткасці ў адносінах, абыякавасць да інвалідаў, хворых, адзінокіх людзей, якія маюць патрэбу ў дапамозе і абароне.

Актуальнай для сацыякультурнага праектавання застаецца праблема дэградацыі значнай часткі насельніцтва, якая выяўляецца ў росце прастытуцыі, наркаманіі, алкагалізму, супрацьпраўных формах паводзін. Зразумела, што асноўная прычына росту злачынстваў сярод моладзі – гэта адмоўныя фактары таго сацыяльна-культурнага асяроддзя, у якім яны існуюць. І вельмі часта малады чалавек або дзяўчына вядзе сябе амаральна, ідзе на злачынства ці самагубства, таму што не мае альтэрнатывы, “не ведае, што творыць”. Гэта часта не віна яго (яе), а бяда. Нават сродкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

масавай інфармацыі прапагандуюць часам куміраў моладзі з асацыяльным вобразам, расце колькасць удзельнікаў і пашыраецца сацыяльная база таталітарных сект і аб'яднанняў нетрадыцыйнай рэлігійнай арыентацыі, якія спрыяюць псіхалагічнай дэфармацыі асобы. Вось чаму так важна праектаваць, а потым рэалізаваць ідэі праектавання такога сацыяльна-культурнага асяроддзя, якое б спрыяла засваенню сапраўдных культурных каштоўнасцей і станаўленню псіхасаматычнага здароўя (спачатку ў рамках малога соцыуму, а потым і ў агульнаграмадскім маштабе).

Сучасная сітуацыя характарызуецца ўзмацненнем патрэбы ў каштоўнасных каардынатах і сэнсавых арыенцірах. Для падтрымкі гэтай тэндэнцыі неабходны праграмы, якія будуць фарміраваць сацыямаральныя ідэалы, праграмы па арганізацыі дзейнасці "элітарных" у духоўным сэнсе формаў сацыяльнай арганізацыі, здольных вырошчваць і падтрымліваць сацыяльна-генетычны патэнцыял (ці код) маральнасці. Асноўны акцэнт у гэтай дзейнасці мы робім на пошуку спосабаў і метадаў ненасільнага вырашэння сацыяльных канфліктаў, развіцця асобы на ідэалах дабрыні, справядлівасці і міласэрнасці. Сацыяльна-педагагічныя праграмы, якія мы складаем, арыентаваны на ліквідацыю дэфіцыту дабрыні, любові да чалавека, уважлівых адносін да яго лёсу. Мы прапагандуем у сваёй праектнай дзейнасці так званую этыку развіццёвага дыялога. Неабходным складаючым элементам амаль усіх нашых праектаў з'яўляецца распрацоўка сацыяльна-педагагічных і псіхалагічных трэнінгаў, якія дазваляюць навучаць моладзь і падлеткаў спосабам і метадам пераадолення канфліктных сітуацый мірнымі сродкамі. Вырашэнне пазначаных задач мае асаблівую цяжкасць, якая абумоўлена галоўным чынам тым, што вельмі доўга грамадства практыкавалася ва ўменні выяўляць і знішчаць ворагаў. А вось майстэрства пераўтвараць ворага ў сябра, саюзніка пакуль знаходзіцца на нізкай стадыі развіцця, і яго давядзецца засвойваць яшчэ вельмі доўга [1].

Найбольш эфектыўныя ў дадзеным напрамку праграмы звязаны з рухамі міласэрнасці і клубамі сацыяльнай дапамогі. Дзяржаўныя службы сацыяльнай бяспекі не заўсёды могуць вырашыць гэтыя праблемы, таму што іх дзейнасць, як правіла, не выходзіць за рамкі аказання матэрыяльнай дапамогі ці рашэння нейкіх арганізацыйна-прававых пытанняў. Чалавеку ж часцей больш важныя простае слова спачування, магчымасць быць пачутым. Формы праектуемай работы груп сацыяльнай дапамогі самыя разнастайныя. Гэта і рэйды міласэрнасці ў шпіталі, дзіцячыя дамы і дамы састарэлых, і маральная дапамога інвалідам і адзінокім людзям, і арганізацыя студэнцкіх псіхолага-пе-дагагічных атрадаў і атрадаў сацыяльнай дапамогі на бясплатнай аснове і інш.

Асноўная ідэя праграмы "Дачыненне" – развіццё эмпатыі, спачування, чуласці, спагадлівасці; змена ўстаноўкі дзяцей і падлеткаў у адносінах да, напрыклад, інвалідаў (перакананасць, што чалавек з дэфектам мае права быць прынятым у грамадстве такім, якім ён ёсць); выхаванне здольнасці прымаць і цаніць людзей з фізічнымі і разумовымі недахопамі. Праграма здзяйсняецца ў розных формах: распрацоўка рэабілітацыйных методык з выкарыстаннем магчымасцей сацыякультурнай дзейнасці; спецыяльныя гульні, лялечны тэатр, арыентаваны на асаблівасці захворвання, музыкатэрапія, казкатэрапія, псіхолага-педагагічны трэнінг і інш. Важнае месца займаюць кансультатыўна-метадычная дапамога сем'ям дзяцей-інвалідаў, арганізацыя і правядзенне фізкультурна-аздараўленчых і лячэбна-аздараўленчых акцый і праграм, арганізацыя ў такім складаным соцыуме калектываў і гурткоў мастацкай сама- дзейнасці і прыкладной творчасці, правядзенне свят і фестываляў.

На кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ёсць цікавы, у пэўным сэнсе унікальны, аўтарскі вопыт распрацоўкі сацыякультурных праектаў, укараненне якіх мела несумненны рэабілітацыйны эфект. Гэта:

— праект сацыяльна-рэабілітацыйнага цэнтра "Наш дом" па рабоце з дзецьмі-інвалідамі (арганізацыя-заказчык – выканкам Фрунзенскага р-на г. Мінска);

— праект комплекснай праграмы "Падай руку сябар сябру", якая са- дзейнічае псіхолага-педагагічнай рэабілітацыі і паўнацэннай адаптацыі ў грамадстве дзяцей з праблемамі слыху. Праект укаранёны і паспяхова дзейнічае на працягу некалькіх гадоў (арганізацыя-заказчык – Беларускае таварыства глухіх);

— праект адаптацыйна-рэабілітацыйнага цэнтра для асоб, якія выйшлі з месцаў пазбаўлення волі. Існуе дзяржаўная сацыяльная ўстанова, якая займаецца прапіскай і працаўладкаваннем такіх асоб, а вось сацыяльна-псіхалагічную дапамогу гэтыя людзі не атрымоўваюць.

Намі быў распрацаваны комплекс сацыяльна-псіхалагічных рэабілітацыйных мерапрыемстваў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— праект праграмы сацыякультурнай рэабілітацыі бежанцаў на тэрыторыі Беларусі. Такі рэабілітацыйны праект распрацоўваўся ўпершыню ў краіне і нават атрымаў грант на рэалізацыю;

— праект стварэння сацыяльна-псіхалагічнай, навукова-практычнай лабараторыі для Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі. Цэнтр выступіў у якасці заказчыка. Лабараторыя створана і па- спяхова існуе.

Распрацоўка названых праектаў – вынік сумеснай творчай працы педагогаў і студэнтаў, працы, якая накіравана на пераадоленне або прафілактыку розных праблем шляхам зместавых ці структурных перамен у сацыякультурным асяроддзі і ў асноўных сферах жыццядзейнасці асобы, стварэнне ўмоў паспяховай самарэалізацыі чалавека за кошт аптымізацыі яго ладу жыцця, формаў і спосабаў узаемаадносін з асяроддзем.

1. *Марков А.П., Бирженюк Г.М.* Основы социокультурного проектирования: Учеб. пособие. – СПб.: Питер, 1997.

2. *Сацыяльная* рэабілітацыя насельніцтва: Практ. дапам. для работнікаў культуры / Пад рэд. А.І.Смоліка. – Мн.: БДУ культуры, 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ